# Большэвікі Віцебшчыны—арганізатары барацьбы працоўных вобласці супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў

**В. ЛАБАНОК**

Вялікая Айчынная вайна 1941—1945 гг. з'явілася ўсебаковым выпрабаваннем усіх матэрыяльных і духоўных сіл савецкага народа. Яна паказала трываласць і непахіснасць савецкага грамадскага і дзяржаўнага ладу, нашых доблесных узброеных сіл. «Савецкі лад, — гаворыць таварыш Сталін, — аказаўся не толькі лепшай формай арганізацыі эканамічнага і культурнага ўздыму краіны ў гады мірнага будаўніцтва, але і лепшай формай мабілізацыі ўсіх сіл народа на адпор ворагу ў ваенны час» (Аб Вялікай Айчыннай вайне Савецкага Саюза, стар. 120).

Неразрыўнай састаўной часткай Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў была ўсенародная партызанская вайна ў Беларусі. Партызанскі рух з'явіўся вялікім укладам у агульную справу разгрому гітлераўскіх акупантаў. Партызаны і партызанкі аказалі сур'ёзную і неацэнную дапамогу Савецкай Арміі ў выгнанні нямецка-фашысцкіх захопнікаў з роднай зямлі.

Разам з усім беларускім народам з першага дня вайны жорсткую барацьбу з ворагам вялі пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый працоўныя Віцебскай вобласці. Па сіле і магутнасці нанесеных ворагу ўдараў, па масавасці і арганізаванасці партызанскага руху, які разгарнуўся ў Віцебскай вобласці, яна займае пачэснае месца ў партызанскай вайне беларускага народа.

З першых дзён вайны абласная партыйная арганізацыя перабудоўвае ўсю сваю дзейнасць на ваенны лад, падпарадкаваўшы ўсё інтарэсам фронта, мабілізуючы працоўных вобласці на аказанне ўсямернай дапамогі Савецкай Арміі ў барацьбе з фашысцкімі ордамі. Асноўныя сілы партыйнай і камсамольскай арганізацыі разам з дзесяткамі тысяч рабочых, калгаснікаў і савецкіх інтэлігентаў пайшлі ў рады Савецкай Арміі. Усё астатняе насельніцтва было арганізавана на будаўніцтва абаранядьных умацаванняў.

З рабочых віцебскіх прадпрыемстваў быў створан полк народнага апалчэння, а таксама сфарміраваны батальён Асоавіяхіма. Апалчэнцы прымалі актыўны ўдзел у абароне горада. Рота Першамайскага батальёна пад камандаваннем тав. Юшкевіча абараняла левы бераг Заходняй Дзвіны на ўчастку ад сада імені Леніна да новага маста, не даючы праціўніку фарсіраваць раку. Батальён Асоавіяхіма (камандзір тав. Клёнаў, камісар тав. Усаценка) на працягу сутак з 9 па 10 ліпеня ўтрымліваў участак ракі ў раёне Мазурына. Пры спробе праціўніка фарсіраваць раку апалчэнцы знішчылі батальён фашыстаў. 10 ліпеня рота апалчэнцаў атакавала на подступах да горада агнявыя пункты гітлераўцаў, знішчыла кулямётныя разлікі і захапіла трафеі.

Вялікая работа была праведзена па эвакуацыі ў тыл краіны старых, жанчын, дзяцей, а таксама абсталявання прадпрыемстваў, гатовай прадукцыі, запасаў сыравіны, рухомага чыгуначнага састава.

Уся дзейнасць абласной партарганізацыі была накіравана на ажыццяўленне ўказанняў, дадзеных таварышам Сталіным у яго гістарычным выступленні па радыё 3 ліпеня 1941 года, дзе ясна і канкрэтна вызначаліся задачы савецкага народа ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі як на фронце, так і ў тылу ворага. Выконваючы мудрыя ўказанні вялікага правадыра, абласны і раённыя камітэты партыі разгарнулі работу па стварэнню партызанскіх атрадаў. Гэтае пытанне было абмеркавана на спецыяльнай нарадзе сакратароў райкомаў партыі ў абкоме КП(б)Б. Стварэнне партызанскіх атрадаў праходзіла пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б) Беларусі. З першых дзён вайны ў вобласць прыехаў сакратар ЦК КП(б) Беларусі В. Г. Ванееў. Азнаёміўшыся са становішчам спраў у раёнах, ён аказаў вялікую дапамогу райкомам партыі ў арганізацыі партызанскіх атрадаў, у стварэнні сеткі падпольных арганізацый, у разгортванні іх работы.

Актыўная дзейнасць партызанскіх атрадаў разгарнулася на тэрыторыі вобласці ўжо з першых дзён акупацыі. 9 ліпеня 1941 года ў Суражскім раёне быў арганізаваны партызанскі атрад з рабочых картоннай фабрыкі імені Вароўскага. На чале гэтага атрада становіцца дырэктар фабрыкі Мінай Філіпавіч Шмыроў і сакратар фабрычнай партарганізацыі тав. Шкрэда. У ліпені 1941 года ствараецца партызанскі атрад у Мехаўскім раёне пад кіраўніцтвам першага сакратара райкома партыі тав. Гуцова і старшыні райвыканкома тав. Волкава. У Лёзненскім раёне ў жніўні 1941 года пачаў сваю баявую дзейнасць атрад «Радзіма» пад камандаваннем Аляксея Дунакалава. Партызанскія атрады і групы ў ліпені — жніўні 1941 года былі створаны ва многіх раёнах вобласці.

Паралельна з арганізацыяй партызанскіх атрадаў абком і райкомы партыі, выконваючы ўказанні Цэнтральнага Камітэта КП(б)Б, стварылі ў гарадах і раённых цэнтрах, на прамысловых прадпрыемствах, у сельскіх саветах і асобных населеных пунктах падпольныя партыйныя і комсамольскія арганізацыі. Многія комуністы былі пакінуты па месцу іх ранейшай работы. Напрыклад, у Лепельскім раёне падпольныя партыйныя і комсамольскія арганізацыі былі створаны ва ўсіх сельскіх саветах. Таксама былі створаны апорныя групы з беспартыйнага актыва. Потым такія антыфашысцкія групы, якія складаліся з беспартыйных калгаснікаў, старшынь і брыгадзіраў калгасаў, былі створаны ва ўсіх сёлах раёна. Кожная партыйная арганізацыя кіравала двума-трыма антыфашысцкімі групамі.

Для кіраўніцтва падпольнымі партыйнымі арганізацыямі і партызанскімі атрадамі абкомам КП(б)Б былі пакінуты ў тылу праціўніка партыйна-савецкія работнікі, комуністы, актывісты. У Мехаўскім раёне, паміма ўказаных вышэй тт. Гуцова і Волкава, былі пакінуты намеснік старшыні райвыканкома тав. Скуматаў, начальнік райаддзялення НКУС тав. Дзячкоў, загадчык аддзела райкома партыі тав. Бажанок, сакратар райкома комсамола тав. Бараноўскі, райупаўмінзаг тав. Емелін; у Багушэўску засталіся ўсе тры сакратары райкома партыі тт. Стэльмах, Прахарэнка і Макарэнка і старшыня райвыканкома тав. Ліксо; у Гарадку — сакратар райкома партыі тав. Каранеўскі, старшыня райвыканкома тав. Рыбакоў, дырэктар МТС тав. Воранаў; у Сіроціне — сакратары РК КП(б)Б тт. Кароткін і Фралоў, старшыня райвыканкома тав. Сіпко, сакратар райвыканкома тав. Эрдман; ва Ушачах — сакратар райкома партыі тав. Ба-

радаўкін, дырэктар МТС тав. Дуброўскі; у Суражы — сакратар райкома партыі тав. Камароў, старшы землеўпарадчык тав. Райцаў; у Чашніках — заг. райана тав. Папкоў і нам. старшыні райспажыўсаюза тав. Баркевіч; у Асвеі — дырэктар МТС тав. Захараў і т. д.

Гэтыя і многія іншыя кіруючыя работнікі, якія засталіся па заданню партыі для разгортвання барацьбы з акупантамі, наладжвалі сувязі з камуністамі, камсамольцамі і беспартыйнымі актывістамі, давалі ім канкрэтныя заданні, рыхтавалі народ для ўзброенай барацьбы ў партызанскіх атрадах.

Падпольным партыйным арганізацыям прыходзілася разгортваць сваю работу ў выключна цяжкіх умовах. Акупіраваўшы тэрыторыю вобласці, немцы прыступілі да насаджэння свайго праславутага «новага парадку». Для абароны гэтага «парадку» былі пастаўлены шматлікія ваенныя гарнізоны, жандармскія і паліцэйскія ўчасткі, гебітскамісарыяты, камендатуры. Былі створаны гарадскія, раённыя, валасныя ўправы, назначаны бургамістры і іншыя органы гітлераўскай улады, скамплектаваны атрады з крымінальнікаў, белабандытаў, усялякіх падонкаў грамадства.

Самавольства, грабёж, насілле і раз'юшаны тэрор панавалі на ўсёй акупіраванай тэрыторыі. Толькі за першыя месяцы свайго гаспадарання ў вобласці фашысты знішчылі ў Віцебску звыш 6 тысяч чалавек мірнага насельніцтва, у Янавічах Суражскага раёна — 1500, у Багушэўску — 250 чалавек і т. д.

Гітлераўцы праследавалі і па-зверску знішчалі камуністаў, камсамольцаў, савецкіх работнікаў, калгасных актывістаў, інтэлігенцыю. У Віцебску, Оршы, Полацку і іншых гарадах вобласці былі створаны канцэнтрацыйныя лагеры для ваеннапалонных і мірных грамадзян, у якіх ад голаду, холаду і катаванняў штодзённа паміралі дзесяткі і сотні людзей.

Гітлераўскія захопнікі разбурылі ў Віцебску і на тэрыторыі вобласці ўсе прамысловыя прадпрыемствы, а абсталяванне вывезлі ў Германію, знішчылі культурна-асветныя ўстановы, школы, музеі, прывялі ў нягоднасць сотні жылых дамоў. Нямецка-фашысцкія мярзотнікі скасавалі калгасы, а маёмасць калгасаў, сельскагаспадарчую тэхніку, грамадскую жывёлу, будынкі, нажытыя шматгадовай працай калгаснікаў, разбурылі і разграбілі. Былых калгаснікаў фашысты пачалі ператвараць у рабоў, аднаўляць уладу памешчыкаў, насаджаць нямецкіх каланістаў. Так, напрыклад, у вёсцы Янова Багушэўскага раёна прыбыўшаму з Германіі памешчыку было аддана звыш ста гектараў лепшай зямлі, якую павінны былі апрацоўваць сяляне.

Сяляне былі абкладзены рознастайнымі і непасільнымі падаткамі і зборамі. Апрача непамерных падаткаў сельгаспрадуктамі трэба было плаціць за ўтрыманне сабакі, за лоўлю рыбы вудачкай, за збор грыбоў, за кветкі на вокнах, за правядзенне вечарынкі і т. д. Быў устаноўлен рэжым, які пазбаўляў самых элементарных свабод асобы. Пасля 9 гадзін вечара забаранялася ўсякае хаджэнне па вуліцы, а па «нарушальніках» дазвалялася страляць без папярэджання. На перамяшчэнне паміж населенымі пунктамі патрэбен быў дазвол стараст і паліцыі. Акупанты і іх прыслужнікі задавальнялі ўсе свае капрызы, расстрэльвалі людзей па самаму малейшаму поваду і без усякага повада.

Спальванне гітлераўцамі вёсак разам з насельніцтвам пачалося з першых дзён акупацыі. Ужо ў ліпені 1941 года былі спалены вёскі Галашчокіна, Засценак, Стрыгі, Навязкі, Цёсы Багушэўскага раёна. У маі 1942 года гітлераўцы спалілі вёскі Слабада Суражскага раёна, Кісцялё-

ва Лепельскага раёна, Кавалькі, Старына, Ліпнікі Полацкага раёна і іншыя.

Адначасова з правядзеннем палітыкі самага жорсткага тэрору акупанты пусцілі ў ход усе сродкі сваёй прапаганды з тым, каб адурманіць насельніцтва, пахіснуць у яго веру ў трываласць савецкай улады, закабаліць народ фізічна і маральна. Яны старанна запэўнівалі, што Савецкая Армія канчаткова разбіта, Масква ўзята і таму ўсякае супраціўленне бескарысна.

Падпольным партыйным арганізацыям у сувязі з гэтым неабходна было разгарнуць сярод насельніцтва вялікую масава-палітычную работу, каб правільна інфармаваць насельніцтва аб падзеях на фронце і ў роднай краіне, выкрыць ілжывую гітлераўскую прапаганду, падтрымаць у савецкіх людзях бадзёрасць, веру ў вызваленне, імкненне ўсямерна дапамагчы роднай Савецкай Арміі сваёй актыўнай барацьбой з нямецкімі акупантамі ў тылу.

Важнай крыніцай палітычнай інфармацыі служылі зводкі Совінформбюро, прымаемыя па радыё. Напрыклад, у Лепельскім раёне радыёпрыёмнік быў устаноўлен у вёсцы Матырына, на кватэры ў беспартыйнага настаўніка Куляшова, які кіраваў антыфашысцкай групай. Два сыны Куляшова — Яўгені і Анатолі — слухалі радыё на чардаку і ўважліва запісвалі паведамленні Совінформбюро. Рэгулярна вяла запісы матэрыялаў, перадаваемых па радыё з Масквы, сакратар партарганізацыі вёскі Залессе Садкоўская, якой удалося ўстанавіць прыёмнік у сябе дома на печы.

Запісы Садкоўскай, Куляшовай і іншых патрыётаў служылі матэрыялам для лістовак «Вести с Родины», якія выдаваліся падпольным райкомам партыі. Лістоўкі спачатку перапісваліся ад рукі, а потым нелегальна друкаваліся пад самым носам у гітлераўцаў — у Лепельскай друкарні, дзе працаваў наборшчыкам сакратар адной з падпольных партарганізацый Сяргей Бараноўскі. Антыфашысцкія групы распаўсюджвалі іх па сёлах. Асабліва ўмела дастаўляла і распаўсюджвала лістоўкі антыфашысцкая група вёскі Губіна, кіраўнікамі якой былі настаўнікі Анатолі Марунька і Матрона Ладзік. У Лепелі лістоўкі распаўсюджваліся групай Дар'і Лаўрыновіч. Тут яны расклейваліся ўсюды, нават на будынках паліцэйскіх участкаў. Ва Ушацкім раёне антыфашысцкія лістоўкі распаўсюджваліся трыма братамі Армонікамі з вёскі Макараўшчына. З гэтых лістовак савецкія людзі пазнавалі праўду аб Савецкім Саюзе, аб становішчы на франтах. Яны даведваліся, што Савецкая Армія стойка вытрымлівае націск фашысцкіх полчышчаў, што родная сталіца Масква стаіць непарушнай крэпасцю, што барацьбой супроць іншакраінных захопнікаў нястомна кіруе вялікі Сталін.

З кожным днём рос уплыў падпольных партыйных арганізацый, актывізавалася баявая дзейнасць партызанскіх атрадаў. У рады народных мсціўцаў ішлі рабочыя, калгаснікі, савецкія інтэлігенты.

Актыўную барацьбу разгарнулі падпольшчыкі і партызаны на Аршанскім чыгуначным вузле пад кіраўніцтвам легендарнага сына беларускага народа, аднаго з найбольш выдатных арганізатараў партызанскага руху ў Беларусі — Канстанціна Сяргеевіча Заслонава. Вярнуўшыся па ўласнаму жаданню ў тыл ворага для барацьбы з акупантамі, Заслонаў скалаціў вакол сябе ядро з адданых савецкіх патрыётаў і разгарнуў на чыгуначным транспарце вялікую дыверсійную работу. За тры месяцы падпольнай дзейнасці на Аршанскім вузле заслонаўцы арганізавалі 98 крушэнняў паяздоў, вывелі са строю і знішчылі звыш 200 паравозаў, сотні вагонаў і цыстэрн, звыш 200 аўтамашын і вялікую колькасць баявой тэхнікі.

Група Заслонава аказала вялікую дапамогу совецкай авіяцыі. Дзякуючы ўмела наладжанай сігналізацыі совецкія лётчыкі разбамбілі дэпо і станцыю Орша, знішчылі буйныя склады ворага з боепрыпасамі ў ваколіцах горада.

Пасля таго, як дыверсійную работу ў Оршы прадаўжаць аказалася немагчымым, Заслонаў у лютым 1942 г. са сваёй групай падпольшчыкаў пайшоў у лес і ўзначаліў партызанскі атрад. Атрад хутка вырас у партызанскую брыгаду, якая стала сапраўднай грозой для гітлераўцаў.

К вясне 1942 года партызанскі рух ахапляе ўсе куткі вобласці. Гістарычны даклад таварыша Сталіна на ўрачыстым паседжанні Маскоўскага Совета 6 лістапада і прамова на парадзе Чырвонай Арміі 7 лістапада 1941 года, а таксама разгром немцаў пад Масквой, які адбыўся ўслед за гэтым, з'явіліся выключным па свайму значэнню стымулам для разгортвання партызанскай барацьбы ўшыр і ўглыб. Дзесяткі і сотні людзей штодзённа ідуць у партызанскія атрады. Маленькія групы вырастаюць у буйныя баявыя адзінкі, якія наводзяць жах на акупантаў.

Створаны яшчэ ў пачатку вайны ў Суражскім раёне маленькі партызанскі атрад тав. Шмырова разросся ў групу шматлікіх узброеных бясстрашных атрадаў. К вясне 1942 года атрады «Бацькі Міная» (так звалі тав. Шмырова ў народзе) мелі на сваім баявым рахунку 1300 знішчаных фашысцкіх салдат, 80 афіцэраў, аднаго генерала, 200 паліцэйскіх і стараст, 50 аўтамашын з жывой сілай і тэхнікай ворага, адну бронемашыну, 50 мастоў. Народныя мсціўцы вызвалілі ад гітлераўскіх захопнікаў 15 населеных пунктаў, арганізавалі і праз лінію фронта накіравалі ў рады Совецкай Арміі да 5 тысяч чалавек.

Спадзеючыся прымусіць камандзіра партызан Шмырова спыніць барацьбу, фашысты захапілі ў якасці заложнікаў яго дзяцей, а затым расстралялі іх. Але гітлераўцам не ўдалося зламаць волю большэвіка. Яго баявая актыўнасць яшчэ больш узмацнілася, удары па захопніках усё больш нарасталі. Слава «Бацькі Міная» і яго партызан разносіцца па ўсёй вобласці і далёка за яе межамі.

Партызаны Мехаўскага раёна за першыя тры месяцы 1942 года знішчылі каля 600 гітлераўскіх салдат і афіцэраў, 85 паліцэйскіх, стараст і іншых здраднікаў, разграмілі ў сямі сельсоветах раёна валасныя ўправы, узарвалі тры масты, чатыры склады з боепрыпасамі, знішчылі пяць аўтамашын з жывой сілай і ваеннымі грузамі акупантаў. Партыйнымі арганізацыямі атрадаў была праведзена вялікая палітычная работа сярод насельніцтва раёна, у выніку чаго звыш двух тысяч чалавек было перапраўлена з фашысцкага тылу ў рады совецкіх узброеных сіл.

У Асвеі і Талачыне, у Гарадку і Ушачах — ва ўсіх раёнах вобласці зямля гарэла пад нагамі захопнікаў. У Віцебску, у самым цэнтры горада, народнымі мсціўцамі былі пакараны бургамістр Брандт і яго жонка. Удзень і ўночы ляцелі ў паветра масты і аўтамашыны, узрываліся склады, з засад і ў адкрытым баі знішчаліся фашысты і іх стаўленікі, граміліся варожыя гарнізоны.

Занепакоенае бурным і бесперапынным ростам партызанскага руху, гітлераўскае камандаванне пачынае звяртацца да пасылкі на барацьбу з партызанамі буйных карных атрадаў і воінскіх часцей. Аднак яны не могуць дабіцца якіх-небудзь істотных вынікаў. Партызаны загадзя даведваліся аб намерах гітлераўцаў, разгадвалі і зрывалі іх замыслы.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы